**Сэрца** вайна не ачарсцвіла / падрыхт. Д. Раманоўскі // Патрыёт (Ушачы). — 2014. — 15 лют. — С. 4.

## СЭРЦА ВАЙНА НЕ АЧАРСЦВІЛА



**Можна параўноўваць многае. А вось вайну параўнаць няма з чым: ва ўсе часы яна была трагедыяй для людзей, асабліва калі вайна гэтая – не твая. 18–20-гадовыя савецкія хлопцы, якім давялося зведаць выпрабаванні за мяжой падчас той страшнай, афганскай, цяпер сталі сталымі мужчынамі. Ім ёсць што расказаць, але ўспамінаюць воіны-афганцы свае баявыя гады неахвотна. «Я так і не зразумеў, навошта мы там былі», – кажа Міхаіл Іванавіч Коўшаль.**

Яго інжынерна-сапёрны батальён размяшчаўся ў Шындандзе. Паведаміў мне Міхаіл Іванавіч, што з нашых, ушацкіх, там быў таксама Мікалай Макаравіч Саўчанка, як і ён – вадзіцелем. Прызываліся ў Савецкую Армію ў адзін прызыў і ў Афганістан прыбылі ў адзін дзень – 26 чэрвеня 1983 года, толькі служылі ў розных воінскіх часцях.

Што трапіць за мяжу выконваць інтэрнацыянальны доўг, М. І. Коўшаль, зразумела, прадказаць не мог, а вось тое, што будзе ў арміі менавіта вадзіцелем, ведаў дакладна. Яшчэ ў 1982 годзе пасля заканчэння сярэдняй школы накіраваўся ад ваенкамата на курсы вадзіцеляў у Докшыцкую аўташколу. Свядома выбраў гэтую мужчынскую справу і нават паспеў папрацаваць некалькі месяцаў у мясцовым калгасе «Дружба».

Пасля інтэнсіўнай агульнавайсковай і спецыяльнай падрыхтоўкі ў Казахскай ССР праз тры з паловай месяцы хлопец з Рагуцкіх за рулём магутнага ЗІЛа-131 апынуўся на афганскіх серпантынах. Усё ў жыцці было ўпершыню і нанова.

– Па горных дарогах вельмі цяжка спачатку было ездзіць, – свае першыя ўражанні Міхаіл Іванавіч памятае добра. – Дарога вузенькая, з аднаго боку — скалы, а з другога – абрыў, унізе — лета, а на вяршынях – зіма.

А яшчэ на такіх «зручных» месцах, дзе, вывеўшы са строю «галаўную» машыну, можна спыніць усю вялізную калону, іх часта чакалі засады маджахедаў. Бывала, што прабіваліся па некалькі гадзін з дапамогай бронегрупы і пад прыкрыццём верталётаў. Машыны забеспячэння хадзілі па ўсіх маршрутах толькі ў суправаджэнні. Значную пагрозу ўяўлялі міны. З горыччу расказвае Міхаіл Іванавіч, як падарваўся аўтамабіль сябра-украінца з яго ўзвода.

Славяне складалі асноўную частку падраздзялення, хаця ў іх батальёне быў сапраўдны інтэрнацыянал – прадстаўнікі 16 нацыянальнасцей праходзілі службу разам з ім. А яшчэ прыпомніў, што асаблівай дружбы народаў у батальёне не назіралася: рускія, украінцы і беларусы больш кантактавалі паміж сабой, у той час як прадстаўнікі каўказскіх народаў, выхадцы з Сярэдняй Азіі трымаліся адасоблена. Але і сур’ёзных канфліктаў не было.

Міхаіл Іванавіч адзначыў, што аб кожным баявым выхадзе, аб гібелі кожнага яго таварыша можна расказаць асобным матэрыялам, але гэта чарговы напамін аб крыві, смерці, аб тым, што ён успамінаць не хоча.

– Гібель чалавека маладога, дужага сама па сабе супярэчыць усялякай логіцы, – уздыхае Міхаіл Іванавіч. – Яшчэ цяжэй было асэнсоўваць тое, што давядзецца праз некалькі дзён перажыць родным і блізкім, калі іх любімага сына, брата, жаніха прывязуць на радзіму ў цынкавай труне.

Адслужыўшы амаль два з паловай года, з іх больш двух – у Афганістане, памужнелы юнак вярнуўся ў мірнае жыццё. Вадзіцельскай справе не здрадзіў. Спрабаваў замацавацца ў горадзе, працаваў на «БелАЗе», потым у пансіянаце «Лясныя азёры», а з пачатку 90-х гадоў у роднай «Дружбе», адкуль калісьці ішоў служыць. Стварыў сям’ю, пасяліўшыся ў Ільюшыне. Разам з жонкай гадавалі двух сыноў і дзвюх дачушак. Але лёсу было мала афганскіх выпрабаванняў для гэтага чалавека. Неспадзявана рана памерла жонка, пакінуўшы на яго чатырох дзяцей, двое з якіх яшчэ вучыліся ў 5 і 6 класах.

Аднак вайна і гора не ачарсцвілі сэрца мужчыны, ён змог пераламаць сябе і не патапіць гора ў віне, не пакінуў сіротамі малых. Дапамагалі бацькі, старэйшыя дзеці, ды і сам працуе ад зары да зары. Сваімі рукамі пабудаваў ля выдзеленага ААТ «Ільюшынскі» дома шматлікія пабудовы, трымае вялікую хатнюю гаспадарку. Старэйшы сын скончыў Лепельскі меліярацыйны каледж, працуе побач з бацькам у таварыстве.

– Зараз намнога прасцей, – кажа Міхаіл Іванавіч. – Дзеці падраслі, яны ў мяне да самастойнасці прывучаныя, многае самі ўмеюць і мне дапамагаюць.

Вось такі ён чалавек. Адзін з ветэранаў-афганцаў, надзейных, правераных людзей. Бачыўшы, што такое вайна, яны ведаюць на ўласным вопыце: мір – вышэйшая каштоўнасць, і ўпэўнены, што калі будзе спакойна на нашай зямлі, то ўсё астатняе прыкладзецца потам і мазалём.

**Падрыхтаваў Д. Раманоўскі**